№№188—189
(2499—2500)

24 лістапада 2006 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!

Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Наведвайце сайт «Народнай волі»!

Паважаныя чытачы “Народнай волі”!
Знайсці нас у Інтэрнеце можна па адрасе **www.nv-online.info**
Там вы зможаце прачытаць артыкулы апошніх нумароў газеты і абмеркаваць іх, даведацца пра падзеі ў краіне і свеце на стужцы навін, напісаць электронны ліст у рэдакцыю.
Архіў газеты можна паглядзець па адрасе **http://nv.promedia.by**

КРОКІ

Ці задумаюцца беларусы над тым, што ім прапануюць?

У мінулы аўторак і ў Мінску, і ў Бруселі Еўракамісія прэзентавала і перадала беларускім уладам свой новы праект стратэгіі ў адносінах да Беларусі.

Еўрасаюз выкладае Беларусі свае прапановы, аднак дадае, што *“на жаль, на гэтым этапе палітыка, якая праводзіцца аўтарытарным рэжымам, спыняе нас ад прапанавання Беларусі поўнага ўдзелу ў нашай палітыцы добрасуседства”* і патрабуе *“палітычных, эканамічных і адміністрацыйных рэформ”*. Спіс таго, што неабходна зрабіць беларускім уладам, прыкладаецца.

Як заявіла ў Бруселі Еўрапейскі камісар па знешніх адносінах і палітыцы добрасуседства **Беніта Феррэра-Вальднер**: *“Народ Беларусі мае права ведаць, што ён губляе. Наша пасланне ў тым, што як толькі краіна выкажа сваю гатоўнасць рухацца наперад да сапраўднай дэмакратыі, правоў чалавека і вяршэнства закона, мы будзем гатовыя ўступіць у поўнае партнёрства з Беларуссю ў рамках ЕПД. Я спадзяюся, што народ Беларусі ўбачыць у гэтым дакуменце шанц звярнуцца да дэмакратычнай будучыні, і што ўрад Беларусі выкарыстае гэтую магчымасць пачаць рэформы, якія патрабуюцца яго народу, і спыніць яго ізаляцыю”.*

Пакуль невядома рэакцыя высокіх беларускіх чыноўнікаў на крок, які зрабіў Еўрасаюз, а вось старшыня Камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу **Вадзім Папоў** ужо даў на Радыё Свабода каментарый: *“Гэта чарговая палітыка дыктата: вы гэта рабіце, а мы затым паглядзім. Не будзе так ніколі. Сустрэчныя крокі павінны быць аднолькавымі... Усе гэтыя песні з адной оперы, як і тыя падвоеныя стандарты”.*

Аляксандр ФЁДАРАЎ.

(Тэкс дакумента чытайце пад рубрыкай “Тэма дня”.)

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Ірына КАЗУЛІНА: «У падарунак на Дзень нараджэння дасылаю мужу сямейныя фотаздымкі»

Аляксандр Казулін згубіў у калоніі яшчэ 2 кілаграмы вагі.

— У гэты панядзелак я размаўляла па тэлефоне з намеснікам калоніі Русланам Прымаком, які традыцыйна паведаміў, што здароўе Аляксандра Казуліна здавальняючае, яго ціск 90 на 60, вага — 73 кілаграмы, — расказала карэспандэнту “Народнай волі” жонка экс-кандыдата ў прэзідэнты **Ірына Іванаўна КАЗУЛІНА**.

— Яшчэ больш пахудзеў?

— Так, яшчэ на 2 кілаграмы. У суботу збіраюся наведаць калонію сама, можа ўдасца атрымаць больш поўную інфармацыю.

— У суботу, 25 лістапада, Аляксандр Уладзіслававіч адзначае свой Дзень нараджэння… Вы нешта перададзіце яму з гэтай нагоды?

— Падарунак я яму пашлю бандэроллю праз пошту — нашы апошнія сямейныя фотаздымкі. Бацькоў, дзяцей, унука, мае... Дашлём маленькі альбомчык, я думаю, што мужа гэта падтрымае.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ТЭМА ДНЯ

Што Еўрапейскі Саюз прапаноўвае Беларусі

Калі Беларусь стане паўнапраўным удзельнікам нашай палітыкі добрасуседства і, такім чынам, паўнапраўным партнёрам Еўрапейскага Саюза, то Еўрапейскі Саюз зможа дапамагчы палепшыць якасць жыцця беларусаў.

З гэтай мэтай Ерапейскі Саюз і Беларусь маглі б працаваць разам дзеля дасягнення наступных паляпшэнняў, якімі б непасрэдна скарыстаўся беларускі народ:

— спрошчанае наведванне беларускімі грамадзянамі краін-сяброў ЕС;

— пашыранае трансмежнае супрацоўніцтва, якое спрыяе большаму ўзаемадзеянню ў эканамічным развіцці, ахове навакольнага асяроддзя і памежным менеджменце;

— падтрымка беларускай эканомікі, дапамога ў развіцці малога і сярэдняга прадпрымальніцтва і падрыхтоўка беларускіх прадпрыемстваў да далейшых магчымасцяў на Еўрапейскім рынку. Гэта стварыла б больш працоўных месцаў і забяспечыла лепшыя перспектывы таксама і для маладога пакалення; гэта магло б быць дасягнута праз эканамічныя рэформы, якія б зрабілі Беларусь больш прывабнай для замежных інвестараў;

— палепшыць сістэму аховы здароўя і адукацыі, падтрымку ўразлівых груп насельніцтва;

— зрабіць дзяржаўнае і мясцовае кіраванне больш эфектыўным для лепшага аказання паслуг насельніцтву;

— рэфармаваць прававую і судовую сістэмы з мэтай забеспячэння роўных правоў для ўсіх. Гэта патрабуе незалежных суддзяў, якія працавалі б у сумленнай і незалежнай манеры, абараняючы правы ўсіх грамадзян і развіццё грамадскай супольнасці;

— лепшыя эканамічныя магчымасці для Беларусі і палепшаныя ўмовы жыцця для яе грамадзян праз развіццё і мадэрнізацыю транспартнай і энергетычнай сістэмы. Гэта б палепшыла аўтамабільнае і чыгуначнае спалучэнне Беларусі з яе суседзямі, як часткі агульнаеўрапейскай і, такім чынам, спрыяла б паездкам людзей і перамяшчэнню тавараў;

— палепшыць стан навакольнага асяроддзя: якасць вады, утылізацыя выкідаў, падтрымка ў барацьбе з наступствамі чарнобыльскай катастрофы;

— удзел у супрацоўніцтве Еўрапейскага маштабу па пытаннях навакольнага асяроддзя, здароўя, стандартаў бяспекі прадуктаў харчавання, умоў працы, авіябяспекі, супрацоўніцтва ў судовай сферы і інш. праз удзел у еўрапейскіх праграмах і сяброўства ў еўрапейскіх агенцтвах.

Мы таксама маглі б развіваць **больш сувязяў** паміж Еўрапейскім Саюзам і Рэспублікай Беларусь:

— мы б спрасцілі кантакты праз мяжу і зрабілі б перасячэнне мяжы прасцей для мясцовых людзей праз супрацоўніцтва з краінамі-суседзямі Беларусі;

— беларускія гарады і адміністратыўна-тэрытарыяльныя адзінкі маглі б супрацоўнічаць з гарадамі і муніцыпалітэтамі ў ЕС, абменьваючыся інфармацыяй і досведам у сферы аказання паслуг насельніцтву;

— мы б прапанавалі беларускім студэнтам больш стыпендый для навучання ва універсітэтах Еўрапейскага Саюза. Мы б заахвочвалі рэгулярныя і доўгатэрміновыя абмены і ўстойлівыя адносіны паміж беларускімі універсітэтамі і універсітэтамі ЕС на ўсіх узроўнях, уключаючы адміністрацыйны і акадэмічны;

— у нас бы мог быць блізкі дыялог і супрацоўніцтва з дэмакратычна абранымі лідэрамі Беларусі, дзяржаўнымі службоўцамі і экспертамі па шырокім коле пытанняў, унутраных і міжнародных, значных для нас усіх. Беларускі пункт погляду мог бы быць шырэй пачуты на міжнароднай сцэне;

— мы маглі б больш актыўна далучаць прадстаўнікоў Беларусі — на нацыянальным, рэгіянальным і мясцовым узроўнях, таксама як і беларускіх афіцыйных асоб, акадэмікаў, навукоўцаў і г.д. да сумеснай працы па вырашэнні агульных, значных пытанняў, падзяляючы і абменьваючыся экспертнымі данымі і ноу-хау ў сферы эканомікі і гандлю, сучаснага кіравання, вяршэнства закона, інфармацыі, адукацыі, турызму, культуры, даследаванняў, навукі, энергетыкі, здароўя, сацыяльных пытанняў, навакольнага асяроддзя, транспарту, камунікацый і іншага.

У нас маглі б быць глыбейшыя **эканамічныя і гандлёвыя сувязі і больш магчымасцяў для бізнесу:**

— лепшы доступ для беларускіх прадуктаў, пры ўмове адпаведнасці нашым стандартам, на рынак ЕС з 480 мільёнамі спажыўцоў, што дапамагло б павялічыць рост беларускага гандлю і істотна ўзмацніла б далейшае эканамічнае развіццё краіны;

— асабліва ў тэкстыльным сектары Беларусі лепшыя магчымасці для доступу беларускай тэкстыльнай прадукцыі на Еўрапейскі рынак;

— калі Беларусь уступіць у Сусветную Гандлёвую Арганізацыю, гэта павінна павялічыць магчымасці для беларускіх прадуктаў у свеце, уключна і ў ЕС.

Для падтрымкі праграм эканамічнага і сацыяльнага развіцця Беларусі мы б **істотна павялічылі Еўрапейскую фінансавую дапамогу,** і прапанавалі б наш каштоўны досвед у правядзенні рэформ.

Беларусь да цяперашняга моманту атрымала значна менш фінансавай дапамогі, чым яе суседзі. Але гэтая сітуацыя магла б змяніцца, і Беларусь атрымала б супастаўна столькі ж дапамогі, колькі і яе суседзі, калі б беларускія ўлады зрабілі істотныя крокі насустрач дэмакратызацыі.

Што ўрад Беларусі можа зрабіць

На жаль, на гэтым этапе палітыка, якая праводзіцца аўтарытарным рэжымам прэзідэнта Лукашэнкі, спыняе нас ад прапанавання Беларусі поўнага ўдзелу ў нашай палітыцы добрасуседства. Еўрапейскі Саюз не можа прапанаваць паглыбіць гэтыя адносіны з рэжымам, які пазбаўляе сваіх грамадзян фундаментальных дэмакратычных правоў. Народ Беларусі — самая першая ахвяра ізаляцыі, навязанай яму афіцыйнай уладай, але ён жа будзе першым, хто скарыстаецца перавагамі прапаноў для дэмакратычнай Беларусі.

Еўрапейскі Саюз жадае падзяліць са сваімі суседзямі дабрабыт, стабільнасць, бяспеку, якімі карыстаюцца яго ўласныя грамадзяне. Гэта патрабуе палітычных, эканамічных і адміністрацыйных рэформ ад нашых краін-партнёраў. Падтрымліваючы нашых суседзяў у гэтых намаганнях, Еўрапейскі Саюз прапаноўвае палітычныя, эканамічныя і гандлёвыя магчымасці, таксама, як і фінансавую дапамогу краінам, якія паважаюць правы чалавека, дэмакратыю і вяршэнства закона. Гэта каштоўнасці, якія Беларусь ужо прызнала сама па сваёй уласнай волі, як сябра ААН, АБСЕ і іншых арганізацый, але якія дзеючы беларускі ўрад на практыцы не паважае. Для пабудовы глыбейшых адносін, якія мы б жадалі мець паміж ЕС і народам Беларусі, для спынення палітыкі самаізаляцыі, якую беларускі ўрад навязаў сваім грамадзянам, мы гаворым, што беларускім уладам трэба, па-першае, і галоўным чынам:

— паважаць **права** народа Беларусі **выбіраць сваіх лідэраў дэмакратычным шляхам** — іх права чуць усе меркаванні і бачыць усіх кандыдатаў на выбары; права апазіцыйных кандыдатаў і груп падтрымкі праводзіць кампаніі без прыгнёту, судовага пераследу або турэмнага зняволення; незалежнае назіранне за выбарамі, беларускімі няўрадавымі арганізацыямі ўключна; права волевыяўлення і права на справядлівы падлік галасоў;

— паважаць **права** народа Беларусі **на незалежную інфармацыю,** і выказвацца вольна, напрыклад, дазваляючы журналістам працаваць без прыгнёту або судовага пераследу, не зачыняючы газеты і не перашкаджаючы іх распаўсюджванню;

— паважаць **правы** недзяржаўных арганізацый, як жыццёва важнай часткі здаровай дэмакратыі — больш не ўскладняць іх легальнае існаванне, не прыгнятаючы і не пераследваючы сяброў грамадскіх арганізацый, і дазваляючы ім атрымоўваць міжнародную дапамогу;

— **вызваліць усіх палітычных зняволеных** — сяброў палітычных апазіцыйных партый, сяброў НДА і простых грамадзян, арыштаваных падчас мірных дэманстрацый і мітынгаў;

— належным чынам і незалежна **расследаваць або перагледзець выпадкі са знікненнем людзей;**

— забяспечыць **права** беларусаў **на незалежную і непрадузятую судовую сістэму** — з суддзямі, незалежнымі ад палітычнага ціску, без самаўпраўнасці і галаслоўнага крымінальнага судовага пераследавання або палітычна-матываванага судовага прысуду, як зняволенне ў турму грамадзян, якія мірна выказваюць свой пункт погляду;

— спыніць **адвольныя арышты і затрыманні, дрэннае абыходжанне з людзьмі;**

— паважаць **правы і свабоды** тых беларускіх грамадзян, якія адносяцца да нацыянальных меншасцяў;

— паважаць **правы** беларусаў як **працаўнікоў** — іх права ўступаць у прафсаюзы і права прафсаюзаў працаваць на абарону правоў людзей;

— паважаць **правы** беларусаў **як прадпрымальнікаў** ажыццяўляць дзейнасць без празмернага ўмяшання ўлад;

— далучыцца да адмены смяротнай кары ўслед за іншымі народамі Еўропы;

— выкарыстаць падтрымку, якую АБСЕ, ЕС і іншыя арганізацыі прапаноўваюць Беларусі для дапамогі ў выкананні правоў сваіх грамадзян.

Еўрапейскі Саюз знаходзіцца ў гатоўнасці аднавіць свае адносіны з Рэспублікай Беларусь і яе народам, як толькі беларускі ўрад прадэманструе павагу да дэмакратычных каштоўнасцяў і асноўных правоў народа Беларусі.

Між тым Еўрапейскі Саюз працягне забяспечваць фінансаванне для Беларусі для аказання дапамогі рэгіёнам, пацярпелым ад наступстваў чарнобыльскай катастрофы або для падтрымкі ў барацьбе супраць гандлю людзьмі, у прыватнасці, супраць гандлю жанчынамі ў Еўропе.

У той жа самы час Еўрапейскі Саюз працягне працу ў напрамку доступу беларусаў да незалежнай інфармацыі, такім чынам даючы ім магчымасць пачуць усе бакі аргументаў, перш чым яны зробяць свае высновы. ЕС працягне падтрымліваць друкаваную прэсу і трансліраванне незалежных тэле- і радыёпраграм для Беларусі. ЕС таксама будзе вітаць і забяспечваць фінансавую падтрымку беларускім студэнтам, якія навучаюцца ў еўрапейскіх універсітэтах.

МНЕНИЕ

Идите в народ!

Может, год или два назад, помню, “Народная воля” выясняла у лидеров партий, много ли их членов работает на крупных промышленных предприятиях. Тогда все отвечали: не знаем, немного, потому что власти чинят репрессии...

Если бы газета повторила опрос, думается, ответы были бы те же. Возьмите любой гомельский завод. Ни на одном не насчитаешь даже сотню человек, которые являются членами какой-либо демократической партии. Да что сотню — десяток не насчитаешь.

Скажете: люди боятся “засвечиваться”, опасаются за свои рабочие места. Это, может, и так. Но мне кажется, что и со стороны руководства партий нет должной организационной работы. Легче, конечно, семинар какой-нибудь провести, съездить за границу, чем приехать, например, в наш Гомель и сагитировать 5—10 рабочих вступить в партию.

Это, кстати, не самоцель, это — конкретная работа с массами. Будь, скажем, на “Гомсельмаше” 90—100 членов Объединенной гражданской партии или Партии БНФ — какая бы работа там развернулась! А так численность партий фактически не растет, их верхушка далека от народа.

**Василий Прокофьевич ПОДЛУЖНЫЙ,
житель г.Гомеля.**

КАМПЕТЭНТНА

Цяжкая ноша шкаляроў

Праблема цяжкіх ранцаў застаецца — школьнікі носяць ранцы вагой 6—8 кілаграмаў, што ўдвая перавышае фізіялагічныя нормы пераносу цяжкасцяў для дзяцей. Пра гэта паведаміў галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Беларусі Міхаіл Рымжа на навукова-практычнай канферэнцыі “Актуальныя праблемы гігіены і эпідэміялогіі”.

Як паведаміў М.Рымжа, тэрытарыяльнымі ўстановамі дзяржнагляду пастаўлена пытанне перад адміністрацыяй школ аб магчымых шляхах змяншэння вагі школьных ранцаў. Гэта можа быць зроблена за кошт забеспячэння ўмоў для захоўвання ў школе спартыўнай формы і абутку, кніг для дадатковага чытання, прылад для ўрокаў працы і г.д. Паводле яго слоў, дадзенае патрабаванне ўносіцца зараз у санітарныя правілы і нормы па школах.

Таццяна ДАРАШЧОНАК.

SOS!

Ад Вас, шаноўныя чытачы, залежыць лёс «Народнай волі»…

Так, паважаныя сябры, мы ў другі раз паўтараем, што менавіта ад Вас залежыць, які лёс напаткае “Народную волю” ў бліжэйшы час. Зможаце падтрымаць выданне фінансамі — будзе жыць, не зможаце — змрочная перспектыва.

У першую чаргу мы паўторна звяртаемся да тых, хто да гэтага часу не зрабіў **перадаплату за лістападаўскія нумары**. Зрабіце гэта, калі ласка, у бліжэйшыя дні.

Ёсць, на жаль, і такія, каму мы дасылалі газету ў кастрычніку, працягваем дасылаць і ў лістападзе, не атрымаўшы **перадаплату**, ужо, лічы, за два месяцы. Усё ж не хочацца губляць наша шчырае сяброўства, таму, даражэнькія, знайдзіце магчымасць разлічыцца з “Народнай воляй”, падтрымайце яе ў цяжкі час.

“Народная воля” — наша і ваша газета. Давайце разам і ратаваць!

Мы звяртаемся да тых заможных людзей, у якіх добрая, светлая душа і якія здольны на дабрачынны крок, — дапамажыце!

Дапамажыце рэдакцыі, дапамажыце тым, хто з'яўляецца прыхільнікам свабоднага слова, хто хоча чытаць “Народную волю”, але не мае фінансавай магчымасці зрабіць адпаведную **перадаплату.**

Мы звяртаемся да ўладальнікаў фірм, бізнесменаў: лепшы падарунак вашым супрацоўнікам, вашым кліентам — камплект нумароў “Народнай волі” за будучыя месяцы.

Мы ў чарговы раз звяртаемся да лідэраў партый, грамадскіх аб'яднанняў, прафсаюзных арганізацый — пацікаўцеся, што чытаюць вашы сябры. Ім, як паветра, патрэбна інфармацыя “Народнай волі”.

На апошняй старонцы нумара мы змяшчаем узоры банкаўскага бланка і абаненцкай (індывідуальнай) карткі з адпаведным каментарыем: **перадаплату** можна зрабіць не толькі за снежань, але і за нумары першай паловы 2007 года.

Адгукніцеся, калі ласка, шаноўныя сябры! Паўтараем: ад Вас залежыць лёс “Народнай волі”.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Мікалай АСТРЭЙКА: «Я абсалютна шчаслівы чалавек»

17 лістапада са шклоўскай калоніі ўзмоцненага рэжыму быў вызвалены актывіст незарэгістраванай грамадскай ініцыятывы “Партнёрства” Мікалай Астрэйка. Нагадаем, што Астрэйка быў асуджаны да двух гадоў пазбаўлення волі за “дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі”. Па прашэсці адной трэці тэрміну Мікалаю нечакана змянілі меру стрымання са знаходжання ў калоніі на папраўчыя работы па месцы жыхарства.

Зараз Мікалай знаходзіцца ў Мінску, дзе з ім і сустрэўся карэспандэнт “Народнай волі”.

— Мікалай, ты ўжо адаптаваўся да бурнага сталічнага жыцця?

— Я б сказаў, што працэс адаптацыі працягваецца. Шчыра кажучы, за тыя дзевяць месяцаў, што я не быў у Мінску, горад змяніўся. Не скажу, што пужаюся машын ці метро, проста пакуль не магу прызвычаіцца да гарадскога рытму. Дарэчы, першую экскурсію па горадзе для мяне праводзілі мае сябры па “Партнёрстве” і саўдзельнікі па крымінальнай справе — Аляксандр Шалайка і Эніра Браніцкая. Мне было аб чым з імі пагаварыць. Яны, як ніхто, мяне разумеюць.

— Рашэнне аб змяненні меры стрымання стала для цябе нечаканасцю?

— Не тое слова! Для мяне гэта быў шок у добрым сэнсе гэтага слова. Я ведаў, што маю права на змяненне меры стрымання на больш мяккую (адбыў адну трэць пакарання, дакументы для змянення меры стрымання ў мяне былі ў парадку), але не верыў, што гэта магчыма. І таму, калі ў пятніцу 17 лістапада дзяжурны абвясціў: “Астрэйка, з рэчамі на выхад!” я нават не адразу зразумеў, куды мяне пераводзяць. А калі зразумеў, то не мог паверыць свайму шчасцю.

— Мяне проста вывелі за вароты калоніі. І ўсё. Так я і апынуўся на волі. На папутцы даехаў дамоў і ўжо тут адчуў сябе абсалютна шчаслівым чалавекам.

— Мікалай, раскажы, калі ласка, што для цябе абсалютнае шчасце?

— Ведаеш, раней я гэтага не разумеў. Шчасце — гэта магчымасць кожны дзень бачыць сваіх блізкіх. Шчасце — гэта магчымасць абняць маці, пацалаваць жонку, патрымаць на руках дачку. Шчасце — калі ўсе блізкія побач. Я адчуў гэта, пераступіўшы парог роднага дома. Для маіх блізкіх мой прыезд таксама стаў прыемнай нечаканасцю. Для мяне нават урачыстая вячэра адышла на другі план, галоўным было — проста быць з роднымі. Увесь вольны час я зараз праводжу з жонкай і дачкой Лізай, якой усяго паўтара месяца і якую я ўпершыню ўбачыў па прыездзе ў Мінск.

— Што было самым цяжкім падчас зняволення?

— Пастаянная абмежаванасць. Праўда, у СІЗА знаходзіцца цяжэй, чым у калоніі. Калі я быў у следчым ізалятары, было цяжка псіхалагічна. Пастаяннае знаходжанне ў камеры з аднымі і тымі ж людзьмі накладвае свой адбітак. А ў калоніі ўжо з'явілася магчымасць хаця б на вуліцу выйсці.

Там, у калоніі, кожны дзень, як дзве кроплі вады, падобны на папярэдні: пад'ём, праца, адбой. Людзі, якія гэтага не адчулі, не да канца разумеюць, што такое воля. А вось калі цябе абмяжоўваюць у свабодзе, тады ўсё хутка пераасэнсоўваеш і разумееш, што трэба радавацца кожнаму вольнаму імгненню.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Народная Воля http://www.nv-online.info
24 ЛІСТАПАДА 2006 г.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Мікалай АСТРЭЙКА:
«Я абсалютна шчаслівы чалавек»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Ці адрознівалася стаўленне адміністрацыі калоніі да так званых "палітычных" зняволеных і астатняга кантынгенту?

— Для адміністрацыі мы былі ўсе роўныя, як у лазні. Са мной сядзелі і прафесар гомельскага універсітэта, і банкір... А таксама крымінальныя элементы. Для супрацоўнікаў калоніі няма прынцыповай розніцы, за што ты сюды трапіў — за забойства ці за перакананні. Іх галоўныя задачы — накарміць, даць зняволенаму спальнае месца і магчымасць недзе працаваць. Дарэчы, у шклоўскай калоніі я працаваў у атрадзе, які займаўся пашывам абутку. Праўда, засвоіць новую спецыяльнасць дасканала не ўдалося. Я быў, так бы мовіць, падсобным рабочым — прыносіў і адносіў скуру, з якой вырабляўся абутак.

— Напэўна, свой адбітак наклаў і інфармацыйны вакуум...

— Інфармацыйны голад — гэта адна з важных праблем, з якой сутыкаюцца зняволеныя. У СІЗА я пастаянна слухаў Беларускае радыё і глядзеў Беларускае тэлебачанне. У калоніі крыху прасцей. Акрамя праслухоўвання лекцый на тэму "На свабоду з чыстым сумленнем" удалося выпісаць тыя нешматлікія незалежныя выданні, якія засталіся ў каталогу "Белпошты". Была магчымасць слухаць Радыё Свабода. Родныя таксама рэгулярна перадавалі незалежную прэсу. У тым ліку і "Народную волю". Карыстаючыся выпадкам, праз вашу газету я хачу перадаць словы падзякі ўсім тым, хто не кінуў мяне самнасам з маёй сітуацыяй. Я атрымліваў шмат лістоў, у тым ліку і ад зусім незнаёмых мне людзей. Усім ім вялікі шчыры дзякуй!

— Мікалай, дзевяць месяцаў зняволення наклалі свой адбітак на здароўе?

— Не без гэтага. Я тут нядаўна ўзважыўся і высветліў, што за гэты час страціў дзесяць кілаграмаў вагі. Гэта ад пастаянных нерваванняў. І хоць турэмную ежу нельга назваць сытнай (мяса не даюць, белы хлеб не даюць), я і да яе прызвычаіўся. Увогуле я не пераборлівы ў ежы, хаця для таго, каб падтрымліваць сябе ў нармальным стане, зняволеныя аддаюць перавагу прадуктам, якія перадаюць родныя з волі. Акрамя страты вагі ў мяне сапсаваліся зубы і абвастрыліся праблемы з сэрцам, якія былі яшчэ на волі. Да стаматолага я ўжо запісаўся, у планах — праходжанне паўнавартаснага медыцынскага абследавання.

— Мікалай, змяненне меры стрымання на папраўчыя работы вядзе за сабой пошук працы?

— Так, я павінен самастойна знайсці сабе працу і ўладкавацца. Таму першай справай, пасля прыезду ў Мінск, я накіраваўся ў міліцыю па месцы жыхарства — Першамайскі РАУС. Там мне далі тэрмін да 30 лістапада. Менавіта да гэтай даты я павінен працаўладкавацца. Шукаю працу па спецыяльнасці — працу юрыста. Прапановы ўжо ёсць. Нейкі працэнт са свайго заробку я буду павінен адлічваць на карысць дзяржавы. Акрамя таго, я павінен пастаянна "адзначацца" ў міліцыі. Гуляць па Мінску познім вечарам і ноччу забаронена. Такія ўмовы... Але гэта не галоўнае. Галоўнае, што я — свабодны чалавек. Няхай сабе і ўмоўна...

Гутарыў Віталь ГАРБУЗАЎ.
Фота Юрыя ДЗЯДЗІНКІНА.

ДАРЭЧЫ

Валерый ДРАНЧУК: «Спадзяюся, што Цімафей хутка будзе на волі»

Як вядома, па справе "Партнёрства" да розных тэрмінаў зняволення былі прыгавораны чатыры чалавекі — Эніра Браніцкая, Аляксандр Шалайка, Мікалай Астрэйка і Цімафей Дранчук. На сённяшні дзень за кратамі застаецца толькі адзін з іх — Дранчук.

Карэспандэнт "Народнай волі" звязаўся з Валерыем Дранчуком, які нядаўна наведваў сына ў калоніі.

— Апошняе спатканне з сынам адбылося 14 лістапада. Цімафей выглядаў нармальна. Аднак сказаў, што ў яго па-ранейшаму баляць вочы. Сын сапсаваў зрок, знаходзячыся ў СІЗА — самі разумееце, там дрэннае асвятленне і "пасадзіць" зрок можна запраста. Пасля пераводу ў калонію Цімафею стала лягчэй — з'явілася магчымасць дыхаць свежым паветрам і рэгулярна займацца фізічнымі практыкаваннямі.

Таксама Цімафей расказаў, што апошнім часам актыўна налягае на кнігі, бо ў яго накапіліся запазычанасці па вучобе. Але ў ЕГУ пайшлі насустрач і думаецца, што са сваімі "хвастамі" сын справіцца.

— Валерый Аркадзьевіч, як вядома, тэрмін зняволення Цімафея заканчваецца ў лютым будучага года. Ці існуе верагоднасць, што ён таксама выйдзе на волю раней?

— Не хачу загадваць, аднак шанцы ёсць. З пункту гледжання закона і падставаў ёсць — сын ужо даўно адбыў палову тэрміну, заўваг з боку кіраўніцтва калоніі ў яго адрас няма.

Напрыканцы месяца ў выканкаме Фрунзенскага раёна адбудзецца пасяджэнне назіральнай камісіі, якая можа прыняць рашэнне аб вызваленні Цімафея. Я спадзяюся, што ён хутка будзе на волі. Але больш за іншых гэтага чакае ягоны сын Платон...

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

СТОП-КАДР

Это крупное дорожно-транспортное происшествие произошло вечером на улице Богдановича в районе Немиги. А сколько их происходит ежедневно по всей стране! И в большинстве случаев виноваты люди. Куда торопиться? Зачем садиться за руль пьяным? Неужели не понятно, что поздней осенью ездить труднее, внимание должно быть повышенным?

ПРЕЦЕДЕНТ

Сухоренко, Шпилевский и Жук против пограничника Волчека

Судебные дела против соратников экс-кандидата в президенты Республики Беларусь Александра Козулина продолжаются. Напомним, что в апреле этого года за "мелкое хулиганство" судили адвоката Игоря Рынкевича. Он тогда смог отбиться от судьи Реутской. Сейчас в поле внимания суда попал руководитель юридической службы опального политика **Олег ВОЛЧЕК.** *Его обвиняют в... контрабанде. Мы попросили Олега Волчека прокомментировать ситуацию.*

— Олег, о Ваших "прохождениях" государственной границы мы наслышаны. Что нового в деле о "контрабанде"?

— Хочу отметить, что я как бывший пограничник, отличник боевой службы на афганской границе никогда не думал, что буду проходить белорусскую границу в "боевом" режиме, как особо опасный преступник. И мне это очень обидно. Буквально на днях я вернулся с международной конференции, организованной ОБСЕ, которая проходила в Вене. Так вот и на пути в Вену, и на обратном пути меня снова с особой тщательностью перетряхивали пограничники и таможня. Причем руководили процессом сами начальники данных служб.

— Так что же хотят найти у Вас представители этих служб?

— Что они могут найти? Фальшивых долларов я не везу, наркотиками не увлекаюсь, даже сигареты в руках не держу. Я уже говорил, что нахожусь в особом "черном" списке КГБ, поэтому они так и напрягаются, используя эту возможность обыскать меня хотя бы на границе. Слава Богу, пока этого не делают на улицах города. *(Улыбается).*

— Вернемся к делу о контрабанде...

— Да, совсем недавно я узнал, что меня заочно осудили за провоз четырех книг, якобы не внесенных в таможенную декларацию. 17 октября 2006 года судья Октябрьского района г.Гродно Л.Жук грубо нарушила мои конституционные права во время рассмотрения административного дела в отношении меня и признала виновным в нарушении ст.193-9 КоАП Республики Беларусь (недекларирование или неверное декларирование товаров и транспортных средств). По ее решению я был подвергнут взысканию в виде штрафа в размере 50 базовых величин в сумме 1.550.000 рублей.

— А почему Вы считаете, что судья нарушила Ваши права?

— Во-первых, я полностью ознакомился с материалами дела и пришел к выводу, что судья Жук при рассмотрении материалов по моему делу грубо нарушила административное законодательство. Одной из главных задач судьи во время рассмотрения административного дела является охрана политических и личных прав и свобод гражданина, и производство по делам осуществляется на основе строгого соблюдения законности.

Вот основные нарушения, которые допущены судьей:

1.Материалы Гродненской региональной таможни, представленные в суд, были составлены ненадлежащим образом. Протокол административного правонарушения не соответствовал требованиям закона, который составляется в присутствии лица, совершившего административное правонарушение. Однако инспектор Ф.Павлович 10 октября 2006 года в отсутствии меня составил протокол об административном правонарушении, при этом в деле не имеется уведомления о приглашении меня.

2.После тщательного ознакомления с материалами дела в суде мне стало ясно, почему Ф.Павлович избегал меня, — все доказательства, считаю, сфабрикованы. По данному материалу не были опрошены не только я, но и должностные лица таможни и пограничной службы, чьи рапорта стали основой моего обвинения.

Ф.Павлович утверждает, что я не предъявил к таможенному оформлению книги "Хроника государственной подлости. Что, как и почему случилось с генералом Юрием Захаренко?" (1 экз.) и "Выборы Президента Республики Беларусь в 2006 году. Факты. Комментарии" (3 экз.).

В действительности по первому требованию Ю.Малевича, который непосредственно осуществлял мой личный досмотр, я представил свои личные вещи для осмотра и сразу же показал, что у меня есть четыре книги. Начальник сказал, что вопросов к книгам у таможни нет. Затем он попросил меня заполнить декларацию, и я заполнил ее в 23 часа 30 минут.

При ознакомлении с материалами дела в суде я обнаружил, что в декларации сделано исправление времени с 23.30 на 22.50. Чтобы устранить все эти противоречия Ф.Павлович был обязан взять объяснения у всех должностных лиц.

Неужели судья не видела этих нарушений? Я думаю, что видела, но попыталась их проигнорировать при рассмотрении дела.

При таких ошибках таможенных органов любой судья был обязан возвратить административный материал обратно для устранения ошибок.

Однако судья не только не выполнила ряда обязательных процессуальных действий по подготовке дела к рассмотрению, но и назначила дело к рассмотрению в рекордно короткие сроки. Дело в суд поступило 16 октября 2006 года, а рассмотрение судья Жук назначила уже на 17 октября на 11.00.

— В таможне без Вашего участия составили в отношении Вас протокол о нарушении. А на суд Вас вызывали?

— В том-то и дело, что нет. Судья Л.Жук начала судебный процесс в мое отсутствие, даже не поставив меня об этом в известность. В деле отсутствуют какие-либо документы, подтверждающие, что я был надлежаще уведомлен судом о времени рассмотрения в отношении меня административного дела.

Тем самым я был лишен возможности защитить в суде свои права: я был лишен возможности давать объяснения по делу, пользоваться помощью адвоката, пользоваться другими правами, предусмотренными законом.

— Да, претензий к судье набирается предостаточно...

— И это еще не все. В суде в ходе судебного заседания даже не велся протокол.

К тому же судья Жук 25 октября 2006 года на личном приеме после суда мне заявила, что она провела судебное заседание в мое отсутствие, так как в материалах дела было мое ходатайство в органы таможни, что я не возражаю против рассмотрения дела в мое отсутствие. Но при ознакомлении с материалами дела такого ходатайства я не обнаружил, и его быть не могло, поскольку я узнал о суде только 23 октября.

— Так в чем же все-таки Вас обвиняют?

— В своем постановлении судья Жук указывает, что изъятые книги являются запрещенными к провозу через границу, поскольку имеется заключение о том, что их содержание может причинить вред политическим интересам и государственной безопасности Республики Беларусь.

— Кто делает заключение о вредоносности книг? Таможенники?

— Нет, КГБ. Председатель Таможенного комитета А.Шпилевский обратился к Председателю КГБ С.Сухоренко с просьбой дать заключение по книгам. Последовал формальный ответ, который по своей структуре и содержанию не может являться заключением. Из него не ясно, кто привлекался в качестве экспертов, специалистов... Думаю, что в КГБ нет специалистов в области лингвистических, филологических, политологических и других наук, которые могли бы дать объективное заключение. Непонятно, на основании какой информации КГБ пришел к выводу, что книги могут причинить вред политическим интересам и государственной безопасности...

— Как Вы собираетесь защищаться?

— Знаете, больше всего меня настораживает и пугает то, что отношение у сотрудников судебной и правоохранительной систем к гражданам, причисленным к оппозиции, особое. На них не распространяется действие закона. В отношении их можно применять любые, самые недопустимые формы давления и нарушения законности. Можно состряпать фальшивый протокол, провести без человека суд, выставив любое обвинение, а ты будешь оправдываться и доказывать, что не совершал этого.

У меня сложилось впечатление, что судья Л.Жук осознанно пошла на данные нарушения. Она понимала, что если отправит материалы обратно в Гродненскую таможню для устранения всех этих ошибок и недостатков, то таможня не успеет исправить их, так как срок привлечения меня к административной ответственности истекал через три дня.

Со своей стороны я подал в Гродненский областной суд и прокуратуру района заявление на отмену постановления в связи с отсутствием события и состава правонарушения. В связи с грубым нарушением законодательства судьей направил жалобу в Управление юстиции Гродненского облисполкома. О нарушениях в отношении меня я уведомил посла ОБСЕ в Минске.

Считаю, что в очередной раз создан судебный прецедент. Книги, которые я провозил, необоснованно поставлены вне закона. Любой правозащитник, политик, просто гражданин может быть осужден за провоз печатных материалов, не понравившихся таможенным органам. Сжимается кольцо вокруг свободы слова, свободы выражения взглядов, вокруг права на любую здоровую и обоснованную критику в адрес руководства страны. Неслучайно год назад парламент по проекту президента принял изменения в Уголовный кодекс, возродив сталинскую норму (дискредитация Республики Беларусь), и дал ей новую жизнь в белорусском законодательстве.

Вопросы задавала Татьяна КИРИЕНКО.

P.S. *Когда номер отправлялся в печать, стало известно об отрицательном решении Гродненского областного суда. О.Волчек готовит жалобу в Верховный суд.*

ОСОБЫЙ СЛУЧАЙ

Почему Максимилиан Климович не нужен Беларуси?

Кажется, вся страна была обеспокоена судьбой Вики Мороз. Президент, министры, депутаты и рядовые граждане возмущались, клеймили, требовали. А в то же время, в родной процветающей стране мальчику Максимилиану больше года не платят положенную ему пенсию. И высокое начальство не интересует, за какие деньги он живет. Хуже того: ни у кого из них не содрогнулась душа, что парнишку в преддверии зимы выселяет белорусский гуманный суд из квартиры на улицу. Между прочим, Вику итальянская семья хотела пригреть, но наши чиновники все, как один, выступили за то, чтобы вернуть девочку на Родину. Но ни один, ни один чиновник не встал на защиту белорусского мальчика, который не выезжал из страны. Для них — его нет.

Мальчик Максимилиан пишет письма. Пишет в райисполком, в министерства, в суды и прокуратуру. Он просит, чтобы ему платили пенсию в связи с потерей кормильца. А еще просит он, чтобы злые дяди не выселяли его из квартирки, где он проживал с отцом до самой его смерти.

А что же отвечают Максимилиану? Начальник главного управления пенсионного обеспечения и социального страхования Министерства труда и социальной защиты В.В.Королев пишет, что да, М.В.Климович действительно является гражданином Республики Беларусь по рождению, но вот не доказано, что он проживает в городе Минске. Оказывается, справки со школы, решения судебных органов, в которых четко обозначено место его обитания, никакого значения не имеют. Чиновнику, видите ли, надо предоставить какие-то секретные, но в установленном порядке документы, устанавливающие факт пребывания на территории страны 8-летнего мальчика Максимилиана. Червь сомнения заел и начальника отдела Прокуратуры РБ Г.А.Шостака. И он написал, что наличие ребенка "на территории Беларуси в установленном порядке не подтверждено, в связи с чем ему отказано в назначении пенсии". Чуть ли не горьковский сюжет: а был ли мальчик? Нечто подобное ответил пареньку и заместитель главы администрации Ленинского района А.П.Алалов, но с уважением, на Вы и с большой буквы. Правда, при этом напрочь отказав Максимилиану в праве получения пенсии и в праве на жилье. "К сожалению, согласиться с тем, что сегодня Ваша мама и Вы законно занимаете квартиру в ГУ "Специальный дом для ветеранов и престарелых и инвалидов номер один" орган опеки и попечительства не может". А коль так, то суды один за одним принимают решение: мальчика Максимилиана и его мать Ирину Владимировну выселить на улицу. И выселяли уже. В лютый мороз. Но Ирина Климович набралась смелости и самовольно (а может, законно?) снова заняла квартиру, где была с мужем до самой его кончины.

И вот здесь настало как раз то время, чтобы прояснить ситуацию. И Владимир Климович, и Ирина были уже немолодыми людьми, когда встретились и полюбили друг друга. Он белорус, чернобылец, инвалид первой группы. Она россиянка, уроженка Омской области. По обоюдному согласию обосновались в Минске. Долго скитались по квартирам. И только в конце 2004 года, когда ликвидатор аварии на ЧАЭС был уже безнадежно болен, ему выделили наконец квартирку в злополучном "специальном доме". Он и ей был рад. Может, на радостях и позабыл занести в документы жену с сыном, а может, как чернобылец, рассчитывал на более комфортное жилье и после получения его думал привести в порядок все бумажки. Не успел, сгорел в марте прошлого года.

И у Ирины Владимировны не заладилось с документами. По приезде в Минск их украли вместе с паспортом. Хотела поехать в Россию, чтобы восстановить, не получилось. Неожиданно заболел муж. Как бросить его и малого ребенка? Ухаживала до последнего дня.

Похоронила Владимира и оказалась у разбитого корыта. Начали выселять, отказали сыну в пенсии. Без документов, без вида на жительство никуда на работу не берут. Замкнутый круг. "Сердобольная" заведующая сектором по охране детства Ленинского райисполкома Е.В.Головнева предложила поместить Максимилиана на шесть месяцев в приют, а маме решить за это время вопрос с получением вида на жительство в РБ, оформлением пенсии и постановки на учет нуждающихся в получении жилья. Каков совет? Если расшифровать, то он звучит так: убирайтесь из квартиры "спецдома", один — в приют, вторая — в Россию. Ну а дальше, если решитесь жить у нас, начинайте все с чистого листа. А как начинать? У Ирины Владимировны ни родственников в Беларуси, ни друзей, ни кола, ни двора. Вот вам забота о россиянах, о которой так красиво говорит глава нашего государства. Вот вам забота о детстве и материнстве. Она тоже у него на устах.

Но оставим на время Ирину Владимировну, которая оказалась без бумажки вроде букашки. Вернемся к мальчику Максимилиану. Несмотря на все отрицательные ответы из высоких инстанций, сын Владимира Климовича имеет право на пенсию и жилье. Известный юрист и правозащитник Николай Микеко считает:

— В соответствии с Жилищным кодексом Максимилиан, как и взрослые, имеет равные права на жилье, на это жилое помещение. Он жил здесь с отцом. И после смерти родителя его права переходят к сыну и матери. И с кем-то из них заключается договор найма. Но этого сделано не было. Более того, предъявили в суд иск о выселении. Но иск не к сыну, а к матери. И его выселяют, как зависящее от кого-то лицо. На самом деле он является правоспособным гражданином и имеет, как я уже говорил, равные права, то есть становится субъектом жилищных правоотношений и иск должен быть предъявлен непосредственно ему. И по Закону о социальной защите граждан, пострадавших от катастрофы на ЧАЭС, Максимилиан имеет ряд льгот, в том числе на жилье и на пенсию. Но его не видят, не замечают, он вроде висит в воздухе и не существует

— Даже первый заместитель председателя Верховного суда А.Федорцов пишет матери Максимилиана: "Ваши доводы, что ваш сын 1998 года рождения не может быть выселен из спорной квартиры, поскольку он проживал вместе с отцом В.М.Климовичем и приобрел право пользования жилым помещением, являются несостоятельными".

— Но Федорцов ничем не обосновал эту несостоятельность. Вот он так думает и все. А Максимилиан в жилищных отношениях от матери не зависит. Нужно смотреть на него, как на личность. И решать вопрос именно с ним. И пенсия должна назначаться по месту жительства заявителя. А они больше года волокитят, не платя ни копейки мальчику. Я вот думаю порой, а есть ли сердце у этих людей? Или вместо него у них пламенный мотор? Ну, не могла Ирина Владимировна бросить больного мужа и маленького сына и ехать в Россию восстанавливать документы. Она действовала как мать, как жена, как настоящий человек. А это ей сейчас в вину вменяют. Некоторые из чиновников договариваются до того, что мать должна ехать в Россию и пусть там выплачивают гражданину Беларуси пенсию в связи с потерей кормильца. Абсурд да и только.

Ирина Владимировна, может, и поедет домой, помыкавшись в Беларуси. Тем более, Владимир Путин подписал недавно еще один указ, связанный с возвращением в РФ соотечественников. На это дело выделены большие деньги. Оплачивается переезд, устройство, решаются вопросы жилья и работы. Новая программа должна улучшить демографическую ситуацию и решить проблему нехватки рабочих рук в стране.

А у нас что, нет этих проблем? Не у нас ли вымирает за год целый огромный район, не у нас ли гибнут на мирном фронте труда сотнями люди? Нам нужны юные Максимилианы и работоспособные Ирины Владимировны. Тем более что Ирина Владимировна очень хочет жить в Беларуси. И живет она у нас, кстати, восемь лет. И может считаться полноправной гражданкой нашей страны. По большому счету, если не смотреть на ее проблему через бюрократические очки, то все можно решить в одночасье. Благо документы у нее теперь все есть.

Кстати, когда я рассказал об этой истории в Представительстве Постоянного комитета союзного государства в Минске, то высокое руководство мне не поверило: такого быть не может, здесь какое-то недоразумение, мы разберемся. Разбирались. И в Администрации президента тоже. Никто не стал на защиту мальчика Максимилиана, он, оказывается, не нужен Беларуси. А вот Вика Мороз — нужна.

Но Ирина Владимировна не сдается. Она пока верит в доброту. Она стучится ко всем и всюду.

P.S. И достучалась. Дохнул осенний хлад, и наш человеколюбивый суд выселил ее и Максимилиана на улицу. Мол, чао, бамбино! И мальчик сегодня, как бомж: ни крыши над головой, ни прописки, ни паспорта. А без него, без паспорта, ни в Россию уехать, ни пенсию получить. Замкнутый круг. И разрывается душа от боли у матери. Прав был Кузьма Чорный, говоря, что женское сердце делается большим, как мир, когда оно слышит плач ребенка.

Но это женское сердце. А сердце чиновника иное, как и глаза. Оловянные они. Поэтому и не видят Максимилиана: а есть ли он, а был ли вообще? Горькая история!

Евгений СОЛОВЬЕВ.

Запомніце гэта імя

З міліцыянераў Гомельскай вобласці абраны самы ветлівы і культурны. Ім прызнаны міліцыянер першай роты 3-га батальёна патрульна-паставой службы ўпраўлення ўнутраных спраў аблвыканкама Яўген Раздольскі.

Малако за так ніхто не аддасць

На асабістых падворках насельніцтва ў гэтым годзе малака закупаецца значна меней, чым годам раней. У цэлым па краіне "мінус" склаў 9%. Паказчыкі зменшыліся ва ўсіх абласцях, але асабліва выдзелілася Мінская і Магілёўская — мінус 14% і 12% адпаведна. Спецыялісты сцвярджаюць, што людзі не жадаюць здаваць малако дзяржаве па вельмі банальнай прычыне — занадта мала плацяць.

Разам супраць птушынага грыпу

Расія да канца гэтага года закупіць найноўшае абсталяванне для дыягностыкі грыпу птушак і бязвыплатна прадасць яго Беларусі. Пра гэта паведаміў кіраўнік Федэральнай службы па наглядзе ў сферы абароны правоў спажыўцоў і дабрабыту чалавека РФ Генадзь Анішчанка.

"Мы знаходзімся ў адзінай эпідэмічнай прасторы, адной краіне з праблемай не справіцца", — зазначыў галоўны санітарны ўрач Украіны Сяргей Бережноў.

Паводле інфармацыі ІТАР-ТАСС, выпадкі захворвання на птушыны грып зарэгістраваныя ў 59 краінах, агульная колькасць хворых — 258 чалавек. З іх 153 чалавек урачам выратаваць не ўдалося.

Чорная субота

У мінулую суботу ў Брэсце зафіксаваны два выпадкі гібелі людзей у выніку падзення з вышыні.

У 21.15 каля дома № 19 па вуліцы Кастрычніцкай рэвалюцыі быў знойдзены труп 15-гадовага падлетка. Паводле папярэдняй інфармацыі, вучань 9-га класа адной з брэсцкіх школ скончыў жыццё самагубствам, кінуўшыся з даху 12-павярховага дома. У гэты ж дзень у 18.15 у адной з бальніц Брэста ад атрыманых траўм памёр 22-гадовы цясляр аднаго з прыватных унітарных прадпрыемстваў абласнога цэнтра. Інвалід другой групы — глухонямы — быў дастаўлены ў лячэбную ўстанову ў 18.10 ад дома па месцы жыхарства на вуліцы Куйбышава. Паводле папярэдняй інфармацыі, малады чалавек выкінуўся з трэцяга паверху з намерам скончыць жыццё самагубствам. Усе акалічнасці трагедыі вывучае пракуратура, якая праводзіць праверку.

Па матэрыялах інфармагенцтваў.

Народная Воля http://www.nv-online.info
24 ЛІСТАПАДА 2006 г.

ЗДАРЭННІ

Дзяўчынцы праламалі галаву на ўроку фізкультуры

У цэнтральную раённую бальніцу Шаркаўшчыны дастаўлена вучаніца 2-га класа СШ №1 з удаўленым пераломам цемянной косткі.

Выходзіць, мы адцураліся спадчыны продкаў? Загаманілі чужой моваю? Відавочна, гэтак могуць разважаць людзі недасведчаныя ці несумленныя. Тым не менш факт застаецца фактам: ці то былая **Жмудзь, ці то Аўкштота завуцца зараз Літвою, а гістарычная Літва — Беларусь.** Прычым у папулярнай літаратуры, уключна з падручнікамі для навучальных устаноў усіх узроўняў, падаюцца два паняцці аб Літве. Адно трактуе гістарычную Літву як краіну этнічных літоўцаў (аўкштоту), другое — нібыта як прадукт асіміляцыі балцкай літвы з прышлымі беларусамі. У абодвух выпадках “літва” падаецца як чужародны этнагенетычна народ. З другога ж боку, беларусы прадстаўляюцца як “маладая нацыя”, што паўстала ў XIV—XV стст.н.э. Праўда, з закаранелым цвярджэннем аб “старажытнасці” беларускай мовы, на якой чамусьці вялося справаводства ва ўсе часы існавання ВКЛ. Пры гэтым пастаянна робіцца спасылка як на дакументальны факт, што Біблія Ф.Скарыны, Катэхізісы, Псалтыры, усе Статуты ВКЛ пісаліся моваю... старабеларускай.

Апераджаючы высновы, усё ж адзначу: ніякай “белай рускай” мовы ніколі не існавала.

Усе сярэдневечныя гістарычныя дакументы ў выглядзе хронік, мап, зафіксаваных “бесед” ды таму падобнае дайшлі да нас як лацінамоўныя. Некаторыя — нямецкамоўныя, у якіх латынь праяўлялася хаця б альфабэтам. На жаль, нам у большасці сваёй бракуе ведаў латыні. Легендарная “мёртвая” мова насамрэч зусім не мёртвая: змярцвелыя хутчэй мы самі. Бо нават не здагадваемся часта, што штодзённа ўжываем іменна латынь. Прыкладам тыя ж палітонімы “Беларусь” і “Літва”, з этымалогіі якой і пачнецца растаямнічванне гістарычнай загадкі.

Дзеля аблягчэння працы возьмем сціплы падручнік лацінскай мовы, скажам, Н.А.Ганчаровай (Мінск. ООО “Новое знание”. 2003), дзе на стар.358 напісана латынню: **Litus** ЛІТус... бераг (мора), узмор’е. Гэты факт дае падставы меркаваць, што тамтэйшыя месцічы маглі зваць сябе і звацца з боку прышлых проста паморамі, жыхарамі ўзмор’я — “літусамі”. Гэта, вядома ж, пры ўмове, што тыя месцічы не мелі ўласнага імя свайго племя.

Але ж фрагменты мапы Сармацыі Еўрапейскай з “Геаграфіі” Пталамея, апрацаванай Ф.Берлінгерам у 1482 годзе, раскрывае імя таго племені. Мала таго, тут паказаны арэал яго: ніжэй выспы, пазней названай Готланд, па акваторыі раскінуты вольны надпіс — Венедіко сено, што азначае Венедская затока; па сушы ж, уздоўж акваторыі — надпіс паўтараецца — Венеде. Гэта ўжо — народ. Паводле звестак Я.Д.Філіповіча, — “народ незлічоны”. Спалучым прыкмету ЛІТУС + ВЕНЕДЫ — і атрымаем народ з новым імем — ЛитВЕНЫ, што значыць, паморскія венеды ці паўночныя венеды. Паколькі арэал венедаў распрасцёрся ад Венедіко сено на поўначы краю да раёна ўпадзення Прыпяці ў Барысен (Дняпро). Гэта можна пабачыць на мапе Рымскай імперыі канца II стагоддзя н.э, змешчанай на ўнутранай частцы вокладкі ўжо нагаданага падручніка. Што яшчэ цікава для нас і карысна ведаць з прадстаўленых мапай звестак? Папершае, тое, што Венеды атаясамліваюцца са... славянамі. Карацей, славяне — гэта венеды, аб чым сведчыць агульны корань слоў: слаВЯНе — ВЕНеды, дзе часціна *“сла”* ўказвае на выхад, выдзяленне. СлаВЯНе — гэта ВЕНеды, што выбылі, выселіліся са сваёй зямлі, як дзеці з роднай бацькавай хаты.

Па-другое, гэтая ж мапа наглядна дэманструе арэал балтаў да таго, як яны перасяліліся на землі Паўночнай Венедыі — ЛІТВЫ. Відавочна, радзімай балтаў былі Прыільменскія абшары, нейкая прастора ў вярхоўях Барысфена, Волгі і Заходняй Дзвіны. Як згадваюць некаторыя гістарычныя крыніцы, тое перасяленне плямёнаў пад агульным назовам “балты” (а гэта, напэўна, куршы, жмудзь, аўкштота, готы, лівы, эсты ды іншыя) адбылося дзесьці ў VI—VII стагоддзях н.э., пасля чаго наша ўзбярэжжа стала звацца Прыбалтыкай, мора — Балтыйскім. А нямецкі вучоны-філолаг Г.Насельман у 1845 годзе насельнікаў узмор’я па-за залежнасцю ад этнасу назваў “прыбалтамі”.

Такім чынам, Літва — гэта Праславенія. І Вялікае княства Літоўскае звалася так менавіта таму, што ў ім дамінавала праславянскае — літоўскае насельніцтва. Што ж тычыцца нязвыклых для сучаснага вуха колішніх імёнаў сярэднявечных нашых вялікіх князёў — Міндоўг, Рагвалод, Гедзімін, Войшалк ды іншыя, таму ёсць некалькі тлумачэнняў. Тое былі імёны дахрысціянскія, гэтак званыя паганскія (з латыні — “сяляне”) нашых далёкіх продкаў. На землях тагачаснай гэтак званай Русі ўласных імёнаў увогуле не было, яны з’явіліся пад уплывам Візантыі і хрысціянізацыі, якая, дарэчы, на абшарах нашага сярэднявечнага краю адбывалася аж да XV стагоддзя. Да таго ж, імёны маглі быць запазычанымі ў суседзяў. Ды, на пасаду князя маглі запрашаць чужаземца, да таго ж — з асіміляванага роду. У любым выпадку сярэднявечныя вялікія князі ў найцяжэйшых умовах стварылі дзяржаву, паважаную ў Еўропе, паспрыялі росквіту культуры народа, першымі ў Еўропе паказалі прыклад прававой дзяржаўнасці праз увядзенне Статутаў, абаранілі краіну ад знешніх ворагаў і перадалі яе нам.

Што тычыцца легенды аб назве нашай краіны Litus ЛІТУС, набытай ад адносна невялікага лацінамоўнага ўзбярэжжа і распаўсюджанай на вялікую тэрыторыю далёка на поўдзень, то ёсць адносна блізкі працэдэнт. Маецца на ўвазе ўсім вядомы палітонім цюркскага паходжання — “Масква”. Тапонім і гідронім *“Масква”* перакладаецца з цюркскай мовы як “гнілое балота”, “брудная вада” — гэта значыць гіблая мясціна. З маленькай засекі, зачатай украінцам Ю.Далгарукім у 1167 годзе на беразе бруднаводнай Масква-ракі, распачалося паселішча з такою ж назваю. З яго пайшло ўтварацца тэрытарыяльна невялікае княства, якое з цягам часу разрослося да краіны з назваю *Масковія*.

Праз амаль трохсотгадовы працэс асіміляцыі Масковіі татара-манголамі, у выніку якога атрымалася арыгінальная па агрэсіўнасці “славянская” дзяржава, што сілай, войнамі заняволіла мноства зямель і народаў: Масковія трансфармавалася ў імперыю.

Так што трансфармацыя лацінамоўнай назвы ўзбярэжжа ў назву нашага краю — з’ява цалкам заканамерная. Тым больш што адбылося тое на абшарах арэалу адзінакроўнага этнасу — венедаў...

Паколькі мае месца блытаніна ў паняццях, адчасна разгледзім этымалогію тэрміна “белы рус” і правамоцнасць ягонага ўжывання. Гэта важна, бо этнагенетычная Літва — наша Айчына — пастаўлена на мяжу выжывання менавіта з прычыны сваёй няпэўнай ідэнтычнасці. Адразу зазначым, што згаданы тэрмін ёсць славяна-лацінская абракадабра, бязглуздзіца. Тэрмін складзены, як бачна, з часціны, вызначаючай акрас — “белы” і “рус” як нібыта назвы народа.

Тут, аднак, да месца будзе нагадаць, што нашыя продкі — венеды — натуральна выкарыстоўвалі сваю, венедскую мову: мы ж не славяне, а праславяне. Калі б сучасная назва нашага народа грунтавалася на аб’ектыўных заканамернасцях, мы павінны б зваца “албарусамі”. Што гэта такое, даведаемся зноў-такі са старонкі 383 ужо згаданага падручніка лацінскай мовы. Тут *rus* (рус) азначае “вёска”. Не імя нейкага адмыслова народа, а вызначэнне паселішча. І толькі! Значыць, гэтак званая Белая Русь — гэта *“белая вёска”*.

На гэтай жа старонцы, ніжэй, у двух сэнсах падаецца яшчэ адзін тэрмін: *rusticus* (рустікус) — што значыць сельскі, вясковы; просты; селянін, земляроб. Выходзіць, беларус — гэта просты, абавязкова сельскі, чамусьці “белы” з вёскі? А дзе імя? Абстрактная ВЁСКА — не назва. Абстрактны “просты” — не імя чалавека. Праўда, з гэтакіх “сельскіх прастакоў”, відавочна, Рурык камплектаваў свае дружыны: прыйшоў жа з “руссю”.

Зрэшты, у акадэмічных выданнях лацінска-рускіх слоўнікаў тэрмін *“рустікус”* падаецца больш шырока: акрамя згаданых характарыстык, там ёсць такія вызначэнні: “неабчэсаны”, “грубы нахабнік”. Імаверна аб такіх “рускіх” людзях распавядаў славуты гісторык С.М.Салаўёў у сваёй кнізе “Чтения и рассказы по истории России”. У яго тагачасная Кіеўская Русь прадстаўлена як “шарашка”, а “вся Русь” — гэта не што іншае, як тагачасныя ваколіцы Кіева. Адкуль нібыта і вядзецца “триединство” (міфічнае).

Больш яскрава аб сярэднявечнай Русі распавёў В.Д.Іваноў у другім томе трохтомнай сваёй працы “Откуда есть пошла Русская земля”. Выключна ганебна праяўляла сябе русь паводле “Акруговага паслання” патрыярха Канстанцінопальскага Фоція ў ягоных “Беседах”. Не менш паведамляе ў гэтым духу аб рускім народзе і артыкул “Житие Георгия Амастридского”, некалькі абзацаў з якога варта прывесці: *“Было нашествие варваров, руси народа, как все знают, в высшей степени дикого и грубого, не носящего в себе никаких следов человеколюбия. Зверские нравами, бесчеловечные делами, обнаруживая свою кровожадность уже одним своим видом...”* Датавана гэта IX ст. н.э.

А вось што распавядае ўрывак з “Бесед” патрыярха Фоція: *“...Я вижу, как народ грубый и жестокий окружает город, расхищает городские предместья, все истребляет, все губит — нивы, жилища, пастбища, стада, женщин, детей, старцев, юношей, — всех поражает мечом, никого не жалея, ничего не щадя...”* Датавана 867 годам. Выкладзена на старонках 550—551 згаданага другога тома.

Мы не можам цяпер дакладна сказаць, якой моваю карысталася тагачасная русь: яна была поліэтнічнай. Але ж мы можам адназначна канстатаваць, што ніякай “старабеларускай мовы” не было і быць не магло. Бо не было такога носьбіта мовы, “белай рускай”. Не было такога этнасу! І ён не з’яўляўся ні ў XIV, ні ў XV стагоддзях. А тым больш у X—XX стагоддзях.

Вельмі слушна па нацыянальным пытанні, на мой выгляд, выказаўся прафесар Е.Е.Шыраеў, аўтар кнігі “Беларусь: Русь Белая, Русь Чырвоная і Літва в картах”: *“Воспрос с определением национальности должен решаться не произвольно, не по личному желанию каждого опрашиваемого, а по действительному его происхождению”.* Зрэшты шкада, што, змясціўшы пад №1 фрагмент арэала венедаў у сваёй кнізе, аўтар не здагадаўся змясціць і мапу Рымскай імперыі пад канец свайго існавання. Але ён заслугоўвае нашай падзякі, акрамя ўсяго, за тое, што практычна, не ведаючы тоеснасці этнагенетычнай літвы і гэтак званых беларусаў, ён канстатуе іх антрапалагічную ідэнтычнасць: гэта ж адзін і той жа этнас!

Такім чынам, сёння, “рус белы”, як і Бураціна, размаўляюць мовамі сваіх лялькаводаў... Паводле слоў акадэміка Г.Гарэцкага, гэтак званая руская мова — гэта мова маскоўская. Яна і дамінуе, на жаль, на абшарах Вялікалітвы, пад псеўданімам “беларуская”: тут вядуць рэй лялькаводы-адэпты Масковіі. Вось толькі важна б ведаць: дзеля чаго ўсё гэта? Дзеля чаго знішчаецца душа аднаго са старажытнейшых этнасаў Еўропы? Каму хораша ад гэтага?

Вялікае княства Літоўскае, як ужо гаварылася, праіснавала амаль 600 гадоў — удвая больш за Расійскую імперыю, якая анексавала яго тэрыторыю, фізічна вынішчыла эліту нашай нацыі.

Адным з найслаўнейшых набыткаў ВКЛ за ўсе часы яго існавання стаў Статут 1588 года. Гэта быў сутнасны дакумент кшталту канстытуцыі, правамоцнасць якога захоўвалася і пасля акупацыі краю Расіяй, пасля чаго ВКЛ як дзяржава перастала існаваць. Але мы, вялікалітоўцы паходжаннем, маем права ганарыцца ім па гэты дзень, і гэтак званыя “беларусы” тут ні пры чым. І, калі мы хочам не толькі людзьмі звацца, але імі быць, то павінны дамагацца вяртання нам нашага сапраўднага нацыянальнага імя: для краю — Вялікалітва, для народа — ліцвіны, літва, літоўцы, што адно і тое ж.

Але перш чым дамагацца, сучаснікам перад усім трэба ўсвядоміць, што да чаго.

Тут, мабыць, дарэчы будзе нагадаць, што замацоўваў сваім подпісам Статут ВКЛ 1588 года манарх Жыгімонт III у адной асобе кароль польскі, Вялікі князь літоўскі, рускі, прускі, жамойцкі, гоцкі, патомны кароль шведскі, вялікі князь фінскі ды іншы. Пад тэрмінам “рускі” маюцца на ўвазе землі былой Кіеўскай Русі. Як бачна, тытулатура Жыгімонта аніяк не фіксуе нейкай міфічнай “Белай Русі”. Яе папросту не існавала ў прыродзе, як і народа пад назовам “беларусы”. Землі, аднак, што складалі ВКЛ, уключна з Полаччынай, Магілёўшчынай, Меншчынай нароўні з іншымі пайменаваны на ст.45 у арт.7. Што ж тычыцца факта, што ў побыце нашы продкі называлі сябе то “тутэйшымі”, то “простымі” людзьмі, тлумачыцца гэтак жа проста: яны былі неадукаванымі, адукацыя ўвогуле вялася на лацінскай ці пазней польскай мовах. Карысталіся ж у штодзённым побыце натуральнай, моваю сваёй спрадвечнай — **венедскай:** славяне ж (тыя, хто пакінуў венедаў) сваю мову прыздаблялі запазычаннямі ў адпаведнасці з тым, у асяродак якога этнасу трапілі. На Масковіі — прымессю маскоўскай мовы, ва Украіне — адпаведна.

Таму па загадзе Жыгімонта III памянёны Статут быў надрукаваны Львом Сапегам моваю не беларускай, як пішуць нашыя сучасныя даследчыкі, а польскай і... рускай. Гэта значыць — кірыліцай, якая ў той час лічылася простай, вясковай — “рускай” у параўнанні з дамінуючай лацінкай. Тое ж і з друкаваннем Бібліі Ф.Скарыны: на яе вокладцы напісана “Бівлія руская...”, значыць, для простых людзей, даступная ім, зразумелая. Абсалютная аналогія і з праваслаўем: распаўсюджанае “простым”, правінцыйным, рускім пісьмом — гэта руская галіна хрысціянства. Паколькі ж сам Ф.Скарына быў, выходзячы з ягонага імя, вуніятам, да таго ж з правінцыі, ён так і прадставіўся ў Падуанскім універсітэце — “русін”.

Усходняя частка нашай краіны, Полаччына, Смаленшчына ды другія, як вядома, знаходзячыся на шляху з “вараг у грэкі”, падвяргаліся рабаванням русі варажскай. Мала таго, на тыя паселішчы русь распаўсюдзіла абавязак плаціць даніну. І нашыя тамтэйшыя продкі вымушаліся яе даваць. Толькі ці маюцца падставы з-за такой калізіі, каб Полаччыну называць “Руссю”? Падобныя варункі этнасу не могуць мяняць. Дарэчы, не варта занадта ўзвялічваць крывічоў: гэта адно са славянскіх плямёнаў, аб якім ёсць у “Аповесці мінулых гадоў” вельмі непрывабныя звесткі. Палян, прыкладам, у параўнанні з мі можна залічваць у арыстакратаў...

Вялікую шкоду гістарычнай праўдзе наносяць, як тое ні неверагодна можа падацца, нашыя супляменнікі ад літаратуры, гісторыяграфіі, журналісты, юрысты, палітыкі. Нярэдка спрычыняюцца да перарыву натуральнага працэсу перадачы інфармацыі пакаленнямі ад бацькоў дзецям. Называючы мову венедаў мовай “русаў” з белым чамусьці акрасам, падштурхоўваюць да нігілізму: маўляў, “а зачем нам какой-то белорусский язык, если есть русский, а ”русская белая мова умирает?"

Варта пагартаць сённяшнія дзяржаўныя газеты і часопісы, паглядзець БТ, паслухаць так званае Беларускае радыё, пачуць нашых правадыроў — валасы дыбам. Адзін лагатып “Советская Белоруссия” чаго варты! А “Звязда”? А “Рэспубліка” з адным-адзіным словам моваю карэннага народа? Дзікунства, невуцтва, абракадабра... А колькі блытаніны, некарэктнасці, ненавуковасці ў працах навукоўцаў? Пачнём спрачацца — да скону веку не скончым. Нібыта ім усім не зразумела, што менавіта з-за няпэўнасці ў самаідэнтыфікацыі народа ён выкарыстоўваецца як скошаная трава — для больш спрытнай “субстанцыі”. Што пры наяўнасці дзвюх Русей побач меншая з іх, а значыць, і слабейшая, ніколі не зможа стаць нацыянальнай дзяржавай. Тым больш суверэннай і незалежнай: Кацярына II нездарма ж 210 гадоў таму заявіла мэту анексіі ВКЛ і ягонае перанайменаванне ў Белую Русь — **“чтоб навеки привязать до России”.**

Хіба не бачна, “прывязаная” да Расіі, наша краіна, дэградуючы сумесна з Расіяй, вымірае шпаркімі тэмпамі. Гэтаму спрыяе згубнасць абыякавага, сервільнага, дэнацыяналізаванага насельніцтва. Яму не прывіта пачуццё чалавечай годнасці, самапавагі, любові да Айчыны сваёй. Яно не ведае каранёў роду свайго і таму не мае спадчыны, якой можа ганарыцца, сілкаваць дух, шчыра любіць, бараніць ды прымнажаць яе моц і славу. Сумна: ніводнага з Вялікіх князёў сваёй Айчыны — ВКЛ гэтак званыя беларусы не ўспрымаюць як сваіх. Сам тэрмін “Літва” ў адносінах да карэнных насельнікаў успрымаецца як чужародны: тут “паклапацілася” прамаскоўская прапаганда сумесна з “нацыянальнымі” спяцамі, якія ў сваіх шматлікіх публікацыях пераканаўча не расшыфравалі этымалогіі тэрмінаў “рус”, “літва”, “славяне”.

Прыкладам Кастусь Тарасаў, асоба, безумоўна, добра дасведчаная, калі меркаваць па ягонай кнізе “Памяць пра легенды”, усё ж дапускае сапраўдны “ляп”. У слове да чытача піша, што Сымон Будны свае кнігі даваў развозіць *“ва ўсе канцы Беларусі, і ў Літву, і ў Польшчу...”* Не ведае, мабыць, майстар слова, што ў часы Сымона Буднага “Беларусі” як краіны і тым больш — дзяржавы не існавала: было Вялікае княства Літоўскае, населенае ў асноўным нашымі продкамі — ліцвінамі, літоўцамі, літвою. І такі “дзёгаць” — праз усю, у цэлым цудоўную кнігу! Колькі ж манкуртаў яна падмацавала гістарычнай лухтой...

Дарэчы, нерытарычнае пытанне, якое ніхто не задае, бо сітуацыя ўспрымаецца чамусьці як сама сабою зразумелая: жамойты, самачынна названыя “просвещеннейшей” Кацярынай II “літоўцамі”, думаць сталі, размаўляць і бачыць сны моваю этнічнай Літвы — нашых продкаў? Не, вядома. У іх свая жмудская, ці жамойцкая. Ну, а мы тады, якой моваю размаўляем, думаем, бачым сны, калі “літва” — нацыянальнае нашае імя?

...Я пішу гэты артыкул моваю Вялікалітвы, як на тым настойваў наш слынны “Даль” — Ян Станкевіч. Дык чаму мы хаваемся, як злодзеі, ад саміх сябе, носімся з абракадабрай, як чорт з пісанай торбай?

Ах, Кацярына Вялікая загадала? А калі мы намагаемся людзьмі стацца, то як быць? Звацца “белавёска”? Ці, мо “простымі” адпаведна латыні? Але ж гэта абсурд, а не імя нацыі!

Колішняе маленькае Маскоўскае княства, намаганнямі поліэтнічнай русі праз захоп чужых тэрыторый трансфармаванае ў Расійскую імперыю, мае заканамерную назву. Наш народ нікога ніколі не гвалціў, нікога не няволіў — дык на якіх тады падставах ён носіць здзекліва-абразлівую мянушку — беларусы (белая вёска, белапрастора, белаправінцыя)? І хто ды калі пакладзе канец гэтай несправядлівасці? Ці не час паставіць пытанне рубам — аб вяртанні нашаму краю законнага свайго імя — Вялікалітва, а народу — ліцвіны, літва, літоўцы. Жамойтаў мы не крыўдзім, тэрытарыяльных прэтэнзій не прад’яўляем. Толькі гістарычную памяць хочам вярнуць — хіба гэта не справядліва? Нарэшце звяжам разарваную гістарычную памяць нацыі літоўскай — ад Міндоўга і надалей...

Эдуард Уладзіміравіч ТОБІН,
жыхар г.Смалявічы.

КОЛОНКА ЮРИСТА

На вопросы читателей отвечает юрист, руководитель благотворительного фонда “Доброслав”
Олег ВОЛЧЕК.

Завещание может быть признано недействительным

Недавно умерла моя бабушка. В 1995 году она приватизировала квартиру. В приватизации также участвовала моя мама и я. В государственной нотариальной конторе мне сказали о том, что моя бабушка за десять дней до смерти оформила новое завещание на моего дядю. Действительно ли это завещание?

О.П.Грудницкая, г.Жлобин.

Считаю, что данное завещание не может быть признано действительным, так как оно не отвечает требованиям законодательства. Дело в том, что ваша бабушка была участницей приватизации квартиры, а не ее полноправной собственницей. Участниками приватизации этой же квартиры являлись также вы и ваша мать.

В соответствии со статьей 7 Закона Республики Беларусь “О приватизации жилищного фонда в Республике Беларусь”, как член семьи, участвовавший в приватизации жилого помещения, Вы имеете право собственности на соответствующую участию долю в приватизированном жилом помещении по данному адресу.

Для этого вам необходимо обратиться в суд с просьбой признать завещание недействительным, а также признать права собственности на долю в размере 6% от общей площади в спорной квартире как участницы приватизации.

Требуйте деньги через суд

6 августа 2006 года между мной и строительной фирмой был заключен трудовой договор, согласно которому я обязался выполнить работу по реконструкции и ремонту стойловых загонов. Согласно акту приемки, работы выполнены качественно и в срок. До настоящего времени наниматель не произвел окончательного расчета. Куда я могу обратиться для того, чтобы со мной произвели расчет за выполненную работу?

А.Н.Ромашкин, г.Сморгонь.

Вам необходимо обратиться с иском о взыскании заработной платы в суд по месту нахождения предприятия. В соответствии со ст. 78 Трудового кодекса Вы можете требовать с нанимателя возмещения выплаты заработанных денег, а также выплаты среднего заработка за каждый день просрочки.

Когда выплачивается материальный ущерб?

Судом принят к рассмотрению иск. В исковом заявлении истец указал, что в результате ДТП, в совершении которого был признан виновным я, он получил легкие телесные повреждения. На основании этого истец просит взыскать с меня в его пользу 56 720 рублей материального ущерба и 2 000 000 рублей морального вреда.

Имеет ли право на данные требования пострадавший?

С.Ф.Калашников, житель г.Минска.

В соответствии с Гражданско-процессуальным кодексом, Вы можете поддерживать заявленные требования, возражать против заявленных требований как письменно, так и устно. Кроме того, Вы можете в своих письменных возражениях требовать обоснования заявленных требований.

Заявив данные требования, истец должен обосновать расчет из которого видно, что он действительно потерял в заработной плате. Исходя из того, что истец работает на предприятии и получает заработную плату, ему был компенсирован лист по временной нетрудоспособности, по которому обычно производят компенсацию исходя из среднего заработка работника, поэтому компенсация по временной нетрудоспособности иногда превышает реальный заработок.

Согласно ст.954 ГК, возмещению при повреждении здоровья подлежит утраченный потерпевшим доход, а также дополнительно понесенные расходы.

Обязанность по возмещению дополнительных расходов возлагается на причинителя вреда только в случаях, когда по заключению МРЭК потерпевший действительно нуждается в определенных видах помощи и не получает их через соответствующие органы бесплатно.

Народная Воля http://www.nv-online.info
24 ЛІСТАПАДА 2006 г.

БЛИЦ

Тончайшие струны души Ивана Тихона

Иван Тихон родился 24 июля 1976 года в деревне Гловлевичи Слонимского района Гродненской области. Было обычное деревенское детство — работа на огороде, сенокос, походы за грибами, ягодами, футбол на лужайке. Первые шаги в спорте сделал на школьных уроках физкультуры. В старших классах увлекся бегом по пересеченной местности. Учеником 10-го класса в 1991 году выиграл районный кросс. Пригласили в Гродненское училище олимпийского резерва на специализацию стайерский бег. Благодаря хорошему питанию, росту и весу в том же году перешел на метание молота. Тренировал его И.В.Цицорин.

В 1997 году Иван стал чемпионом Европы среди молодежи. На Олимпийских играх 2000 года в Сиднее занял четвертое место с результатом 79.85. Сотрудничество с И.Цициориным себя исчерпало.

С 2001 года И.Тихона тренирует олимпийский чемпион Сергей Литвинов. Он нашел нужные слова. Труд остался прежним, работать Ваня больше не стал. Произошли незначительные изменения в технике, а прибавка получилась семь метров. Иван стал чемпионом мира 2003-го, 2005 годов. На Олимпийских играх 2004 года в Афинах завоевал серебряную медаль. Победил на зимнем чемпионате Европы 2005 года.

Последние дни перед чемпионатом Европы 2006 года в Гётеборге (Швеция) Иван провел дома, недалеко от знаменитого Жировичского монастыря. Вдали от шума городского настраивался на евростарты. Метатель, как пианист, должен тщательно готовиться к выступлению, настраивая тончайшие струны души. И результат не заставил себя ждать. Иван стал чемпионом Европы с результатом 81.11. Был приглашен в сборную Европы на Кубок мира.

Лучший результат Ивана — 86.73 является рекордом Беларуси и всего на один сантиметр меньше рекорда мира. Чтобы совершать дальние броски, надо настраиваться на нужную волну. Броски за 80 метров происходят на уровне супертончайших ощущений. Все зависит от четких, филигранных, отточенных движений, постановки ног, то есть от техники. Это удалось И.Тихону, когда он едва не побил мировой рекорд. Идеальное исполнение движений, точные действия ног, работавшие как часовой механизм, — и получился феноменальный по дальности полет молота... Такое не забывается!

— Что для Вас значит спорт?
— Спорт — это моя жизнь.
— Главная цель в жизни?
— Совершенствование в спорте. Стать олимпийским чемпионом. Установить мировой рекорд.
— Жизненные ценности?
— Честность, правдивость.
— Что цените в других людях?
— Профессионализм.
— Ваше хобби?
— Поехать в деревню, побродить по лесу.
— Как проводите отпуск?
— Пока без отпуска, только чередование нагрузок по объему, интенсивности.

— Какие книги читаете?
— Классику.
— Какую музыку любите?
— Рок и Владимира Семеновича Высоцкого.
— Какие кинофильмы предпочитаете?
— Добрые старые фильмы, комедии Гайдая.
— Как относитесь к авангарду в искусстве?
— Многим нравится яркость красок, необычность сюжетов, композиций.
— Футболом интересуетесь?
— Периодически.
— Любимая команда?
— "Рома".
— Любимые цветы?
— Лилии.
— Какие страны понравились и чем?
— Австралия — удивительными красотами природы. Япония — духовным уровнем и высокой культурой. А больше всего понравилась Франция с ее сказкой — Парижем, где бродишь по улицам и отдыхаешь, удивляешься. Недаром Эрнест Хемингуэй сказал: "Это праздник, который всегда с собой".
— Какая кухня нравится?
— Славянская.
— Любимое блюдо?
— Полендвичка.
— Следите за модой?
— За спортивной. Имею контракт с "Найком".
— Чем гордитесь кроме основной работы?
— Имею маленького сына.
— Есть друзья?
— Есть близкий друг.
— Ваши самые преданные болельщики?
— Тренер, родители, соседи.
— Вас узнают на улице?
— Узнают, жмут руку, желают удачи.
— Верите в приметы?
— Верю, что ничего случайного не бывает.
— Как можете себя охарактеризовать?
— Я добрый и спокойный.
— В быту привередливый?
— Мне достаточно самого необходимого без излишеств.
— Как снимаете стресс?
— Тренировками.
— Вы азартный?
— Азартный — в работе.
— Какие праздники отмечаете?
— Православные. В рабочем режиме.
— Любимая пора года, погода?
— Люблю все поры года и всякую погоду.
— Отношение к конкурсам красоты?
— Самое положительное. Приятно любоваться гармонией тела и духа.
— Что себе пожелаете?
— Эффективнее бороться с ленью, быть жестче в характере.
— Что такое счастье?
— Заниматься любимым делом, творить добро.
— Место на земле, милее всех?
— Где родился. Нет ничего на свете милее родного края с песней жаворонка над родными полями и лесами.
— Что Вы чувствуете на пьедестале?
— Гордость за свою страну.

Евгений МАКСИМОВИЧ.

МАЗАІКА

Беларускія хакеісты аб'ядноўваюцца з расіянамі?

Ужо ў наступным сезоне адзін з беларускіх хакейных клубаў, хутчэй за ўсё, будзе гуляць у вышэйшай лізе чэмпіянату Расіі.

Гэта галоўны вынік сустрэчы прэзідэнта Федэрацыі хакея Расіі Уладзіслава Трацяка з Аляксандрам Лукашэнкам і кіраўніцтвам нацыянальнай Федэрацыі хакея Беларусі.

У адрозненне ад каманд з Казахстана, якія выступаюць у Расіі па-за конкурсам, беларускі прадстаўнік атрымае права выхаду ў суперлігу.

Пакуль невядома, якая каманда будзе прадстаўляць Беларусь у расійскім чэмпіянаце і па якім прынцыпе яна будзе камплектавацца.

Вось вам і слабая палавіна!

У нямецкім Дзюсельдорфе прайшоў матч за званне чэмпіёнкі свету па боксе па версіі GBU ў найлёгкай вагавай катэгорыі паміж ураджэнкай Беларусі Алесяй Граф (зараз яна жыве ў Германіі) і амерыканкай Хітэр Персіваль па мянушцы Тыгрыца.

Бой з амерыканкай стаў для Алесі ўжо трэцяй абаронай тытула. Хітэр Персіваль не паспявала за былой гамяльчанкай, час ад часу атрымлівала па зубах, і, хоць накаўта не атрымалася, аднак суддзі аднадушна аддалі перамогу нашай суайчынніцы.

Мірны — за стабільнасць!

Атрымаўшы пераканаўчую перамогу ў Шанхаі ў фінальным турніры серыі "Майстарс", беларускі тэнісіст Максім Мірны не змог усё ж такі апярэдзіць у рэйтынгу амерыканцаў Браянаў.

Браяны "вылецелі" з розыгрышу яшчэ на групавой стадыі турніру, а Максім Мірны і Йонас Б'ёркман сталі пераможцамі спаборніцтваў, хоць і гэтага не хапіла — адставанне беларуса ад амерыканцаў склала 50 ачкоў.

Што датычыцца адзіночнага выступлення, то Максім Мірны зараз на 59-й пазіцыі. Ва Уладзіміра Валчкова — 744-е месца, у пары Сяргей Тарасевіч — 612-ы.

Алесь ФЁДАРАЎ.

ФИЗКУЛЬТ-УРА!

Как Гарри Погоняйло моржом стал

Многие знают Гарри Погоняйло как известного юриста и правозащитника, но, наверное, мало кто догадывается, что Гарри Петрович — еще и морж со стажем.

На переднем плане — Гарри Петрович в юности.

"Я родился в тюрьме, до десятого класса рос в детских домах, — вспоминает **Гарри Петрович ПОГОНЯЙЛО.** — *И забав, конечно, хватало... Когда жил в Архангельской области, очень любили весенний сплав леса по Северной Двине, рядом с рекой находился наш детдом. У нас, детдомовских пацанов, считалось высшим пилотажем допрыгать по сплавляющимся бревнам до другого берега и вернуться обратно. Иногда приходилось падать в ледяную воду, карабкаться обратно на бревна, для некоторых игры заканчивались смертельным исходом. Мы были по-детски бесшабашны, старались показать свое геройство. Можно было скатиться в сугроб на санках с крыши двухэтажного дома, двадцатиметровую елку затаскивали на гору и спускали ее вниз "головой" вперед. Мы цеплялись за ветки и летели вместе с ней. Когда елка переворачивалась, ветки могли выколоть глаза".*

В детских домах Гарик провел около восьми лет. На Севере, в Архангельской области, очень много болел, был худеньким, слабеньким, некоторые паренька уже готовили "на погост". С 6 до 10 лет Гарри восемь раз болел воспалением легких, в 1954-м, когда к власти пришел Никита Хрущев, ослабленных интернатовских детей вывезли в Крым. Каждое лето возили на море. С утра дети трудились на сельхозработах, после обеда шли купаться.

"В Крыму мы начинали купальный сезон уже 1 апреля, — рассказывает Гарри Петрович. — *А однажды на море со мной едва не случилась беда. Мы с братом решили искупаться в сильный шторм — около 4—5 баллов. Мне тогда было лет тринадцать, плавал я неплохо (километров пять мог проплыть спокойно), а кому же не приятно покататься на таких огромных волнах?! Брат остался на берегу, я нырнул в подходящую волну. Она была такая высокая, что мне казалось — взлетаю выше горы Ай-Петри. Волна — метров шесть. Отплыл метров двести от берега, уже возвращаюсь назад, но понимаю, что к берегу не приближаюсь. Волны меня поднимают, и я скатываюсь по ним назад. Тогда я решил нырять под волну и плыть под водой. Но самое неприятное ожидало возле берега. Огромнейший прибой закрутил меня вместе с песком, гравием, камнями и унес обратно в море. Я терял последние силы в этом водовороте камней. Люди на берегу метались, но ничем помочь мне не могли. Каким-то образом я все-таки выбрался — зацепился за камни, песок, вышел весь израненный и избитый. Тело на следующий день было все синее.*

Но был в Крыму случай и пожуже. В том месте, где мы жили, а это село Лазовое за Симферополем, есть Симферопольское водохранилище. Зимой мы любили скатиться на санках с крутого берега прямо на лед. Однажды мы с другом так вот и скатились, провалились и вдвоем ушли под лед. Я подо льдом сумел сориентироваться, развернулся на 180 градусов и нашел лунку. Мой друг погиб. Позже воспитатели сказали, что от разрыва сердца. Наверное, тогда я и решил избавиться от страха перед холодом и водой..."

Щупленький паренек, который вполне мог стать жертвой более сильных сотоварищей по детдому, отстаивал свои честь и достоинство любыми способами — кулаками, зубами, до крови... Физический авторитет соперников его не сдерживал. В школе-интернате Гарик занимался боксом, борьбой, позже стал членом белорусской молодежной сборной по греко-римской борьбе, был чемпионом Белгосуниверситета. В университете Гарри был незаменим — его отправляли на соревнования по вольной борьбе, самбо, тяжелой атлетике. В шутку ребята называли Гарри Погоняйло миниатюрным Гераклом. При весе в 57 кг он спокойно нес на спине два мешка цемента по 50 килограммов. "Если не закалишь характер и тело, то и по жизни будешь тряпкой", — решил тогда парень. И следует этому принципу всю жизнь.

"Всерьез моржеванием я занялся в армии, — говорит мой собеседник. — *Служил в Горьковской области, в Краснознаменном учебном центре истребительной авиации войск ПВО. На территории гарнизона было искусственное озерцо. Вот я каждое утро туда и бегал, пробивал лунку или небольшую дорожку, нырял. Климат там континентальный, морозы достигали минус 35 градусов, хотя мой личный рекорд купания — при минус 29. В такой мороз приходилось купаться голышом, чтобы кое-что не примерзло к плавкам, пока добежишь до раздевалки. И так каждый день, это было в какой-то степени самоистязанием, но я закалил свой дух, характер..."*

Гарри Петрович рассказывает, что сейчас в Минске моржеванием заниматься особо и негде, хотя в конце октября (когда начались морозы) уже успел искупаться в одном из белорусских водоемов.

"Я до сих пор в любое время года могу без какой-либо психологической подготовки дать нырца и летом, и зимой, — признается он. — *Однажды на Рождество, 25 декабря, искупнулся в океане в Лос-Анджелесе, где я был с рабочей поездкой. Температура воды была всего 4—5 градусов тепла, но нам не привыкать. В апреле с группой были в Дании, на берегу еще лед лежал, но я тоже не упустил возможности искупаться. В феврале попробовал водичку в шведском Мальме. Если есть водоемы и есть настроение — я сразу лезу в воду. Сила тела — это сила духа".*

Алесь СИВЫЙ.
Фото из семейного архива

Несколько советов начинающим моржам от Гарри Погоняйло:

1. Прежде всего начните закаливание организма с контрастного душа, при этом постепенно понижая температуру.

2. После этого переходите на холодный душ, причем начинайте обливание холодной водой с ног, а не с головы.

3. Тем, кто хочет закаляться в водоеме, нужно начинать купание с августа. При этом купание должно быть ежедневное.

4. Перед тем, как вы решили заняться моржеванием, все же посоветуйтесь с врачом — возможно, по специфике вашего организма вам противопоказано купание в ледяной воде.

ВЕДАЙ НАШЫХ!

«Юнацтва» — у фінале!

Вельмі драматычна складваўся ў мінулыя выхадныя рашаючы матч паўфінальнага турніру Кантынентальнага кубка паміж мінскай камандай "Юнацтва" і казахскім "Казахмысам" — балельшчыкі маглі і плакаць, і смяяцца...

Мінчане падышлі да рашаючай гульні з перамогамі над аўстрыйскім "Рэд буллам" і кіеўскім "Сокалам", казахі — з тым жа. Усё вырашалася ў размове тэт-а-тэт.

...Пасля першага перыяду — 0:0. Пасля другога — па нулях. За хвіліну да заканчэння гульні беларусы прайгравалі — 0:1, песімісты пакідалі Палац спорту з апушчанымі галовамі, але за 40 секунд да фінальнага свістка арбітра зала проста выбухнула — "Юнацтва" зраўнавала лік.

А ў дадатковыя 5 хвілін овер-тайма нашым хакеістам спатрэбілася ўсяго 52 секунды, каб казахі прызналі: "Капітулюем!"

Такім чынам, "Юнацтва" заняла першае месца ў групе і заваявала пуцёўку ў фінальны турнір, які пройдзе з 5 па 7 студзеня ў венгерскім Секешфехервары. Сапернікамі мінчан будуць мясцовы "Алба Волан", расійскі "Авангард" і фінскі "Ільвес".

Алесь СІВЫ.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Ад вас залежыць лёс «Народнай волі»...

Мяркуем, Вы цяпер добра ведаеце, у якой сітуацыі апынулася газета. Таму, калі Вы яшчэ не зрабілі **перадаплату за лістападаўскія нумары**,— хутчэй у любы філіял "Беларусбанка", а там дзе іх няма, — на пошту! Не забудзьце зрабіць **перадаплату і за снежаньскія нумары**.

Калі ёсць магчымасць адначасова зрабіць перадаплату за нумары першай паловы 2007 года — будзем удзячны!

Усе пытанні можна вырашыць таксама ў офісе рэдакцыі. Сума **перадаплаты** за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Як вы заўважылі, кошт газеты ў першай палове 2007 года застаецца на ўзроўні 2006 года.

Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля":
р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

У чарговы раз звяртаем увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ,** узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары. Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі.

Разумеем: для Вас, шаноўныя чытачы, гэта дадатковыя цяжкасці. Але што зробіш: каб Вы своечасова атрымлівалі газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за ноябрь, декабрь				
(ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за ноябрь, декабрь				
(ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ
Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов

Абонентская карточка
на номера газеты «Народная воля»
за ноябрь, декабрь 2006 года
(ненужное зачеркнуть)
Заполняется отчетливо печатными буквами и обязательно отправляется в редакцию с копией платежного документа

фамилия
имя отч.
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* корп. кв.

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

ВАКОЛ СПОРТУ

Майк Тайсан стане «самым папулярным жарабцом»?

Былы абсалютны чэмпіён свету па боксе ў суперцяжкай вагавай катэгорыі Майк Тайсан згадзіўся абслугоўваць жанчын у публічным доме.

Прынцыповай дамоўленасці наконт гэтага дасягнула вядомая "Мадам Галівуд", Хайдзі Флейс, якая ў бліжэйшы час пачне будаўніцтва новага публічнага дома ў Невадзе. Па словах Флейс, Тайсан стане "самым папулярным жарабцом", бо ў бардэлі будуць працаваць толькі мужчыны.

"Хайдзі прапанавала мне гэтую работу, і я згадзіўся, — пацвердзіў інфармацыю былы баксёр. — Галоўнае, каб я падабаўся жанчынам, асабліва калі мне за гэта яшчэ будуць і плаціць".

Нагадаем, што ў 1991 годзе Майк Тайсан быў асуджаны за згвалтаванне "Міс Амерыкі", аднак затым быў выпушчаны з турмы датэрмінова.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 22.11.2006 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №